# САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ

**Свабода!**
**Справядлівасць!**
**Салідарнасць!**

Бюлетэнь БСДП, г. Магілёў, №8, верасня 2013г.

**Мы – Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) – партыя справядлівасці і раўнапраўя.**
**Мы верым, што кожны беларус мае права на годны ўзровень жыцця і вялікія эканамічныя магчымасці. Мы выступаем за тое, каб былі вернуты тарыфы на растаможку аўтамабіляў прыгнаных з Еўропы і ЗША да ўзроўню, які існаваў да 1 ліпеня 2011 года.**
**Мы назіраем сітуацыю, калі беларускі аўтапарк на працягу апошніх двух год старэе і амаль не абнаўляецца. Цэны на падтрыманыя аўтамабілі б'юць усе магчымыя рэкорды, а якасць старых аўто жадае быць куды лепшай. Гэта сказваецца на бяспецы, камфорце і экалогіі грамадзян.**
**Беларусаў ад жыхароў СНД заўжды адрозніваў сучасны аўтапарк, дзе беларус сярэдняга дастатку мог дазволіць сабе даволі прыстойнае аўто ўзростам ад 3-10 год. Мытны саюз адабраў у нас такую магчымасць і працуе не на карысць простых грамадзян.**
**Далучайцеся да нас у барацьбе за зніжэнне тарыфаў на растаможку аўтамабіляў!**

## ІГАР БАРЫСАЎ: "БЕЛАРУСКІ АЎТАПАРК СТАРЭЕ НА ВАЧАХ. ТРЭБА ТЭРМІНОВА ВЫПРАЎЛЯЦЬ СІТУАЦЫЮ"

**Калі яшчэ не так даўно Беларусь знешне амаль не адрознівалася ад Заходнееўрапейскіх краін па існуючаму ў ёй прыватнаму аўтапарку, то цяпер яна з кожным годам пачынае нагадваць дэпрэсіўныя правінцыйныя раёны Расіі і Украіны.**



На фота Ігар Барысаў намеснік старшыні БСДП

Дайшло ўжо да таго, што добра "паюзаныя" аўтамабілі ў Расіі, пачалі паступаць на ўнутраны рынак Беларусі. Акрамя бэўшных расійскіх аўто, якія пачалі купляць беларусы, істотна павялічыўся продаж новых расійскіх аўтамабіляў маркі "Лада", пра якасць якіх складзены не адзін анекдот.

Некалі ўзгаданую "Ладу" забаранялі прадаваць у некаторых краінах Еўропы, як маланадзейную, з нізкім узроўнем бяспекі. Чаму простыя беларусы ва ўгоду ўсходняму суседу сталі ахвярамі сваіх палітычных інтарэсаў?

### Няма свайго легкавога аўтапрама

Калі Расія і Казахстан ставілі за мэту абараніць свае прадпрыемствы ад канкурэнцыі і захаваць рынак збыту легкавых аўтамабіляў, то Беларусь у гэтым пытанні стала заклад-ніцай падпісанага дагавора аб Мытным саюзе і ўвядзенні непамерна высокай растаможкі на ўвазімыя на яе тэрыторыю (не з краін Мытнага саюза) аўтамабілі.

Назваць нацыянальным аўтапрамам у Беларусі выпускаемыя іранскія "Саманды" ці кітайскія "Гіа" не паварочваецца язык. Колькасць вырабленых і прададзеных аўтамабіляў дадзеных марак складае адзінкі, бо беларус, чалавек разумны і ўжо даўно ацаніў перавагу бэўшных Мэрсэдэсаў, Аўдзі, Фольксвагенаў, Тайот і Нісанаў і аддае перавагу гэтым сусветна вядомым брэндам.

### Крыху арыфметыкі

Да 1 ліпеня 2011 года дзейнічалі адносна лагодныя тарыфы на растаможку прыгнаных з Еўропы і ЗША аўтамабіляў. Усе былі задаволены. Дзяржава атрымлівала рэгулярны прыбытак за ўвазімыя машыны, а беларусы раз на год маглі выбіраць сабе тое, што адпавядала іх густу і фінансавым магчымасцям.

Да прыкладу БМВ 530D E39 1999г. да 1 ліпеня 2011 каштавала растаможыць 2250 еўра, цяпер – 15000 еўра, Suzuki Grand Vitara 2001 г.з ЗША, аб'ём 2700 - 1620 еўра, зараз

**АНЕКДОТЫ В ТЕМУ**

- В Тольятти делают Ладу Калину...
- Паша, её здесь производят, а делают её в каждом гараже по пять раз в год!

***

Почему Лада - хорошая машина для зимы?

- Потому что ремень безопасности пристегивать не нужно, задница сама примерзает к сиденью.

- 13500 еўра. Калі казаць пра эксклюзіўныя аўто недаступныя для сярэдняга беларуса, то яны сталі недаступнымі і для больш заможных грамадзян. Каб прыгнаць, напрыклад, Viper GTS 1994 года, аб'ёмам 8000 з цаной у – 34 000 еўра трэба заплаціць пошліну – 45 600 еўра.

У некаторых выпадках растаможка ўвазімых аўто становіцца большая, чым цана самаго аўтамабіля.

**Выхад ёсць**

**Тым часам час паказвае, што абыходзіць унутраныя дамоўленасці, прынятыя ў межах Мытнаму саюзу, можна не толькі на прыкладзе продажу нафты пад выглядам растваральнікаў, аднак і на прыкладзе адмены растаможкі на нелегкавыя аўтамабілі для грамадзян, якія займаюцца бізнесам у населеных пунктах дзе пражывае да 50 тысяч чалавек.**

Дастаткова прыгадаць Дэкрэт прэзідэнта Рэспублікі Беларусь №6 ад 7 мая 2012 года "Аб стымуляванні прадпрымальніцкай дзейнасці на тэрыторыі сярэдніх, малых гарадскіх паселішчаў, сельскай мясцовасці", дзе камерцыйныя арганізацыі, фермерскія гаспадаркі і індывідуальныя прадпрымальнікі, якія зарэгістраваныя ў гэтай мясцовасці не меней за сем год да 1 снежня 2013



TOP-10 легковых автомобилей.
В десятке наиболее популярных легковых автомоби
стоимостью до 18000 Usd.

| № | Модель | Продажи | Класс |
|---|---|---|---|
| 1 | Lada Priora | 1231 | B |
| 2 | Lada Niva | 871 | SUV-B |
| 3 | Volkswagen Polo седан | 856 | B |
| 4 | Renault Logan | 759 | B |
| 5 | Renault Sandero | 649 | B |
| 6 | Kia Rio | 562 | B |
| 7 | Skoda Octavia | 548 | C |
| 8 | Kia Sportage | 401 | SUV-C |
| 9 | Daewoo Matiz | 319 | A |
| 10 | Lada Samara | 301 | B |

года вызваляюцца ад растаможкі нелегкавых аўто, якія прыганяюцца з Еўропы і ЗША. Сюды трапляюць трактары, аўтамабілі для перавозкі 10 і болей пасажыраў, грузавікі і транспарт спецыяльнага прызначэння.

Чаму, калі ўжо была зроблена такая лазейка ў заканадаўстве на нейкі час, нельга зрабіць і яшчэ адну – стаць уладам на бок людзей і вярнуць ім права ездзіць на нармальных аўтамабілях, якія бы можна было мяняць раз на год?

**Аб нашай ініцыятыве**

Актывісты Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) ініцыююць кампанію за вяртанне тарыфаў на растаможку аўтамабіляў у межах пошлін, якія існавалі да 1 ліпеня 2011 года і права звычайным грамадзянам прыганяць сабе аўтамабілі з Еўропы і ЗША адзін раз на год. Мы плануем правядзенне круглага стала прысвечанага дадзенай праблематыцы, а таксама арганізацыю збору подпісаў пад зваротам да дэпутатаў з просьбай паўплываць на вырашэнне склаўшайся сітуацыі.

Мы перакананыя, што пытанне з разтаможкай аўтамабіляў, увазімых з Еўропы і ЗША, прынята не на карысць беларускіх грамадзян. Улічваючы той факт, што ў краіне на 1 студзеня 2013 года было зарэгістравана 3 817 792 транспартных сродкі (уключаючы легкавыя і грузавыя аўтамабілі, матацыклы, скутары і г.д.) відавочна, што дадзенае пытанне актуальна для вялікай часткі грамадзян.



## АЎТАПАРК БУДУЧАГА ПРЫ ЦЯПЕРАШНІХ ПОШЛІНАХ НА РАСТАМОЖКУ

# ДА ЎВАГІ АЎТАЎЛАДАЛЬНІКАЎ!

**Беларуская-сацыял дэмакратычная партыя (Грамада) мае намер правесці ў Магілёве круглы стол, прысвечаны праблеме высокіх тарыфаў на растаможку аўтамабіляў, прыганяемых з краін Еўрапейскага саюзу і ЗША.**

**Падчас круглага стала адбудзецца шырокае абмеркаванне дадзенай праблематыкі, а па яго выніках будзе падрыхтаваны зварот да ўладаў, пад якім адбудзецца збор подпісаў за зніжэнне існуючых тарыфаў да межаў прымальных для звычайных грамадзян.**

**Калі вы жадаеце прыняць удзел у абмеркаванні, а таксама выказаць сваю думку адносна ўздымаемай тэмы, то вы можаце запісацца на круглы стол па тэлефоне + 375 29 743 51 52, ці праз e-mail: gazetanm.eu@gmail.com. Вам дадаткова паведамяць аб даце, месцы і часе правядзення мерапрыемства.**

- А что у вас за машина?
- Лада 'Калина'. Но попалась какая-то ненадежная. Наверно бракованная.
- А следующую машину, какую брать будете?
- Ладу 'Калину', не могут же они все быть бракованными.
- А что ваш психиатр говорит?
- А откуда вы знаете, что я у психиатра наблюдаюсь?

# ДЕЙСТВУЮЩИЕ СТАВКИ ТАМОЖЕННЫХ ПЛАТЕЖЕЙ ДЛЯ ФИЗИЧЕСКИХ ЛИЦ

| Возраст автомобиля | Стоимость, объем двигателя | Ставки таможенных пошлин |
|---|---|---|
| 3 года и менее | стоимость которых не превышает 8 500 евро | 54 процента таможенной стоимости, но не менее 2,5 евро за 1 см$^3$ |
| | стоимость которых составляет более 8 500 евро, но не превышает 16 700 евро | 48 процента таможенной стоимости, но не менее 3,5 евро за 1 см$^3$ |
| | стоимость которых составляет более 16 700 евро, но не превышает 42 300 евро | 48 процента таможенной стоимости, но не менее 5,5 евро за 1 см$^3$ |
| | стоимость которых составляет более 42 300 евро, но не превышает 84 500 евро | 48 процента таможенной стоимости, но не менее 7,5 евро за 1 см$^3$ |
| | стоимость которых составляет более 84 500 евро, но не превышает 169 000 евро | 48 процента таможенной стоимости, но не менее 15 евро за 1 см$^3$ |
| | стоимость которых составляет более 169 000 евро | 48 процента таможенной стоимости, но не менее 20 евро за 1 см$^3$ |
| От 3 до 5 лет включительно | объем двигателя не превышает 1 000 см$^3$ | 1,5 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 1 000 см$^3$, но не превышает 1 500 см$^3$ | 1,7 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 1 500 см$^3$, но не превышает 1 800 см$^3$ | 2,5 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 1 800 см$^3$, но не превышает 2 300 см$^3$ | 2,7 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 2 300 см$^3$, но не превышает 3 000 см$^3$ | 3 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 3 000 см$^3$ | 3,6 евро за 1 см$^3$ |
| Более 5 лет | объем двигателя не превышает 1 000 см$^3$ | 3 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 1 000 см$^3$, но не превышает 1 500 см$^3$ | 3,2 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 1 500 см$^3$, но не превышает 1 800 см$^3$ | 3,5 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 1 800 см$^3$, но не превышает 2 300 см$^3$ | 4,8 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 2 300 см$^3$, но не превышает 3 000 см$^3$ | 5 евро за 1 см$^3$ |
| | объем двигателя составляет более 3 000 см$^3$ | 5,7 евро за 1 см$^3$ |

# ДУМКІ МАГІЛЁЎЦАЎ АБ ДЗЕЮЧЫХ ТАРЫФАХ НА РАСТАМОЖКУ

Парк аўтамабіляў паступова старэе. Новую машыну набыць звычайнай сям'і вельмі цяжка. Лезці ў крэдыты – не выхад. Калі б дзяржава пайшла насустрач чалавеку і хаця бы раз у 5 год давала магчымасць на прыгон аўто з Еўропы, то гэта было бы добра.



**Леанід Падбярэцкі**
**Ездзіць на Сеат Таледа**
**1994 года**



**Дзмітрый Яўстратаў**
**Ездзіць на Аўдзі 80**
**1991 года**

Мытны саюз супраць беларусаў. Ніхто, як заўжды, не падумаў пра звычайных грамадзян. Калі нічога не зменіцца ў бліжэйшы час, то праз пару год будзе страшна па вуліцах хадзіць і ездзіць.



Гэта капец! У краіне няма ўласнай вытворчасці легкавых аўтамабіляў. Рабіць такія кошты на растаможку для звычайных грамадзян – гэта маразм! Патрэбен перагляд гэтых пошлін.

**Андрэй Двігун**
**Ездзіць на Форд Эскорт**
**1993 года**

Калі б пошліны на растаможку былі б на ўзроўні, які існаваў да ўступлення краіны ў Мытны саюз, то я бы ездзіў на куды лепшай машыне. Перакананы, што са мной салідарны многія беларусы. Адназначна, з гэтым мірыцца нельга!



**Максім Кавалёў**
**Ездзіць на Аўдзі 100**
**1993 года**

**Паважаныя грамадзяне!**
**Дадзены калектыўны зварот да прадстаўнікоў нашай ўлады будзе размешчаны для абмеркавання на сайце Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады) па адрасу BSDP.ORG. Яго можна каментаваць, а таксама ўношаць прапановы па зменах. Пасля правядзення круглага стала будзе вызначаны канчатковы варыянт звароту да чыноўнікаў і пад ім пачнецца збор подпісаў. Далучайцеся да нашай ініцыятывы. Тэл. +375 29 743 51 52, e-mail: gazetanm.eu@gmail.com**

Депутатам Палаты представителей
Национального собрания Республики Беларусь
Администрацию президента
Республики Беларусь
Совет Министров
Республики Беларусь

## КОЛЛЕКТИВНОЕ ОБРАЩЕНИЕ

*(О необходимости снижения пошлин на автомобили, ввозимые из стран Евросоюза и США для физических лиц)*

**Мы**, нижеподписавшиеся граждане Республики Беларусь, **выступаем за** существенное **снижение тарифов на растаможку автомобилей**, ввозимых в нашу страну из стран Евросоюза и США **для физических лиц**.

**Мы видим** в чрезмерно больших тарифах на растаможку автомобилей **несправедливость** по отношению к нам, простым гражданам, в сравнении с другими гражданами стран членов Таможенного союза (России и Казахстана), **ведь наша страна не имеет собственного легкового автопрома**, который необходимо защищать специальными пошлинами для обеспечения прибыльности своих предприятий и занятости рабочих.

**Наш автопарк** за последние два года практически **не обновлялся.** Несмотря на это цены на поддержанные авто только возрастают из-за чего страдает безопасность граждан, загрязняется экология, снижается комфорт передвижения, увеличивается количество ремонтов транспортных средств. Новые же автомобили себе могут позволить всего несколько процентов беларусов.

**Мы считаем, что наше правительство должно пойти нам на уступки и снизить тарифы на растаможку для легковых автомобилей до уровня тарифов, которые существовали в стране до 1 июля 2011 года.** Мы выступаем за то, чтобы в страну могли ввозиться поддержанные автомобили возрастом до 10 лет и возможность их приобретения для физических лиц составляла один раз в два года. Европейские и американские автомобили создают Беларуси имидж европейской страны, которая по своему автопарку контрастирует с Россией и Казахстаном, а также с другими странами СНГ, что является видимым показателем благосостояния граждан.

**Мы убеждены, что законодательство, касающееся пошлин на ввозимые автомобили из стран нетаможенного союза, можно обходить внутренними декретами и этому уже есть яркие примеры - это Декрет №6 президента Республики Беларусь "О стимулировании предпринимательской деятельности на территории средних, малых городских поселений, сельской местности"**, согласно которому до 1 декабря 2013 года в страну можно без растаможки ввозить трактора, спецтехнику, грузовые автомобили и автомобили для перевозки 10 и более пассажиров для коммерческих фирм и индивидуальных предпринимателей, которые зарегистрированы и осуществляют свою деятельность на протяжении семи лет в населённых пунктах с населением менее 50 тысяч человек.

## Папулярныя аўтамабілі ад 3-х да 5-ці год і аб'ёмам да 1.5, якія зараз можна увозіць у Беларусь з мінімальнай растаможкай



Нісан Кашкай
1.5 - 2550 еўра



Аўдзі А3
1.4 - 2380 еўра



Фольксваген Б6
1.4 - 2380 еўра



Шкода Суперб
1.4 - 2380 еўра

**САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТ**

Галоўны рэдактар
ВІТОЛЬД НЯЎРЫДА

Бюлетэнь Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамады)
Надрукавана ў Магілёве на ксераксе. Наклад 299 асобнікаў
Распаўсюд бясплатны.
Выраблены пра тэхнічнай падтрымцы рэдакцыі газеты «НАШ Магілёў»
e-mail: bsdpps@tut.by